ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 9 (804) ● Чацвер, 11 сакавіка 1971 г. Цана 2 кап. ● Год выдання XXIV

## У ПАРТКОМЕ БДУ

◆

Па заданню парткома былі праверaны падрыхтоўка і правядзенне камсамольскіх сходаў у групах на фізічным, хімічным і геаграфічным факультэтах. У выніку азнаямлення з дакументацыяй, гутарак з камсамольцамі, а таксама наведання сходаў на гэтых факультэтах камісіяй устаноўлена, што сходы ў пярвічных камсамольскіх арганізацыях праводзяцца адпаведна Статуту ВЛКСМ. У камітэтах камсамола распрацаваны перспектыўныя планы работы на ўвесь навучальны год, а на курсах і ў групах— на семестр.

Камсамольскія сходы ў групах і на курсах рыхтуюцца сумесна з прадстаўнікамі партбюро, дэканатаў, куратарамі груп. У многіх групах на першых і другіх курсах перад сходам збіраецца актыў, дзе разглядаюцца пытанні, якія выносяцца на абмеркаванне. Павесткі сходаў паведамляюцца камсамольцам за некалькі дзён. На сходах, акрамя камсамольцаў, выступаюць і члены партбюро, і прадстаўнікі дэканата.

Разам з тым, як адзначыла камісія, у практыцы правядзення і падрыхтоўкі камсамольскіх сходаў на факультэтах ёсць істотныя недахопы. Парушаліся, напрыклад, тэрміны правядзення такіх сходаў на IV курсах фізічнага, хімічнага і геаграфічнага факультэтаў. Не пазбаўлены фармальнасці пастановы камсамольскіх сходаў, рашэнні прымаюцца яшчэ ў многім агульныя і часта выражаюцца ў такіх словах, як «павысіць паспяховасць», «палепшыць наведванне», і толькі. Такое бывае асабліва там, дзе не атрымалася дзелавая размова і сход заканчваўся адразу ж пасля выступлення камсорга або куратара (7 і 8 групы III курса хімфака, III курс геафака, IV курс фізфака). Фармальна прымаліся ў многіх групах і сацыялістычныя абавязацельствы па Ленінскаму заліку. Так, на геаграфічным факультэце большая частка камсамольцаў прымала такія абавязацельствы без належнай галоснасці і абмеркавання.

Многія сакратары камсамольскіх бюро адносяцца да сваіх абавязкаў яшчэ даволі халатна, не наладжваюць кантроль за дзейнасцю груп. Напрыклад, сакратар камсамольскага бюро III курса хімфака не ведае нават, калі і якія сходы праходзяць у групах. На гэтым жа курсе не вядзецца камсамольская дакументацыя. Тут ні на адным сходзе не разглядалася выкананне раней прынятых пастаноў. У планах работы не прадугледжаны мерапрыемствы, прысвечаныя XXIV з'езду КПСС і 50-годдзю універсітэта.

У некаторых групах фізічнага і хімічнага факультэтаў на сходах адсутнічае амаль трэцяя частка камсамольцаў. Не адбываецца часам і дзелавая размова на пасяджэннях камітэта камсамола геаграфічнага і хімічнага факультэтаў.

Слабая падрыхтоўка сходаў, фармалізм у іх правядзенні, адсутнасць строгага кантролю за выкананнем прынятых рашэнняў і іншыя недахопы ў рабоце прыводзяць да таго, што камсамольскія сходы пазбаўляюцца сваёй асноўнай функцыі — быць школай выхавання для моладзі, не аказваюць неабходнага ўплыву на паспяховасць і дысцыпліну студэнтаў.

Заслухаўшы і абмеркаваўшы пытанне аб практыцы правядзення камсамольскіх сходаў, партыйны камітэт БДУ прыняў пастанову, накіраваную на ліквідаванне недахопаў, якія маюцца ў рабоце камсамольскіх арганізацый факультэтаў.

◆

Камісія парткома, якая вывучала дзейнасць партыйнага бюро матэматычнага факультэта (сакратар І. А. Прусаў), адзначыла, што гэты калектыў праводзіць даволі вялікую работу па паляпшэнню навучальнага працэсу, развіццю навукі, выхаванню студэнтаў. Авангардную ролю на ўсіх участках работы адыгрываюць камуністы.

Аднак у дзейнасці партыйнага бюро факультэта яшчэ няма пэўнай сістэмы. У планах бюро на першы і другі семестры намечаны толькі партыйныя сходы і пасяджэнні партбюро. Партыйныя сходы ў верасні і лістападзе мінулага года не праведзены. У асобных выпадках партсходы і бюро праводзяцца без старанна й падрыхтоўкі. Так, на партсходах у чэрвені па пытаннях працоўнага семестра і спартыўна-аздараўленчых мерапрыемстваў выступілі 3 камуністы, а ў жніўні па пытаннях вынікаў 1969-70 навучальнага года і задач на новы перыяд выступілі толькі 2 камуністы. Такія важныя пытанні, як абмеркаванне і зацвярджэнне на пасяджэнні партбюро саставу ідэалагічнай камісіі і куратараў груп, планаваліся, але не былі пастаўлены.

Ёсць выпадкі, калі асобныя камуністы не з'яўляюцца на партыйныя сходы без уважлівых прычын. Пратаколы партыйных сходаў і пасяджэнняў бюро афармляюцца з некаторымі адступленнямі ад прыкладнай інструкцыі па вядзенню справаводства ў пярвічных партыйных арганізацыях. Многія пункты пастаноў сходаў і пасяджэнняў неканкрэтныя. З пратаколаў партсходаў не відаць, ці інфармуюцца камуністы аб ходзе выканання пастаноў папярэдніх сходаў і як яны выконваюцца. У планах ідэалагічнай работы намечаны мерапрыемствы, якія не заўсёды маюць непасрэднае дачыненне да такой работы.

Недастаткова ўвагі ўдзяляе партбюро матфака насценнаму друку. Састаў рэдкалегіі факультэцкай газеты на пасяджэнні партбюро не зацвярджаўся, не абмяркоўвалася і тэматыка чарговых нумароў. Самі члены партбюро ў газеце не выступаюць, а аддзел партыйнага жыцця і рубрыка «Па слядах нашых выступленняў» у ёй адсутнічаюць.

Не заўсёды ставяцца ў цэнтр увагі партыйным бюро і пытанні вучэбнай работы. Хоць, праўда, у гэтым навучальным годзе ў параўнанні з мінулым паспяховасць некалькі павысілася, але ўсё ж па выніках зімовай экзаменацыйнай сесіі яна застаецца самай нізкай ва універсітэце. Паменшылася колькасць студэнтаў, якія займаюцца на добра і выдатна, затое павялічылася колькасць троечнікаў. Найбольшая колькасць нездавальняючых адзнак прыпадае на першыя-другія курсы (64 і 55 працэнтаў адпаведна). Гэта гаворыць аб тым, што партбюро матфака не змагло накіраваць дзейнасць кафедр і дэканата на выкананне пастановы савета і рэктарата універсітэта аб рабоце з першакурснікамі.

Недастаткова поўна кіруе партбюро работай грамадскіх арганізацый. Камітэт камсамола і прафбюро не зусім дакладна выдзяляюць галоўныя напрамкі ў сваёй рабоце. Па абмяркоўваемых пытаннях не заўсёды прымаюцца канкрэтныя рашэнні.

На ўсе гэтыя і іншыя недахопы ў рабоце партыйнага бюро матэматычнага факультэта была звернута ўвага парткомам універсітэта ў прынятай пастанове.

● НАСУСТРАЧ XXIV З'ЕЗДУ КПСС

## СЛОВА СТРЫМАЛІ

Перадз'ездаўскае спаборніцтва ў БДУ паклала свой адбітак на дзейнасць кафедр, лабараторый, усіх універсітэцкіх служб. Чым бліжэй знамянальная падзея, тым больш вестак аб выкананні абавязацельстваў, прынятых у гонар з'езда. Завяршаюцца планавыя даследаванні, уводзіцца ў дзеянне новае абсталяванне, укараняюцца лепшыя методыкі.

На днях наш карэспандэнт пагутарыў з загадчыкам кафедры радыёфізікі і электронікі ЗВЧ Уладзімірам Васільевічам Ізохам, папрасіў яго расказаць, як калектыў рыхтуецца сустрэць XXIV з'езд КПСС:

— Ужо зараз можна сказаць, што ўзятыя абавязацельствы мы перавыканалі. Падрыхтаваны тры вучэбныя дапаможнікі па курсах імпульснай тэхнікі, паўправадніковых прыбораў, па дыфракцыі радыёхваляў.

Чытаюцца новыя спецкурсы: «Электронна-фізічныя вымярэнні» і «Тэорыя сігналаў і ланцугоў». Абаронена 6 дысертацый, з іх адна—доктарская.

Кафедра вядзе вялікую навукова-даследчую работу. На сённяшні дзень эфектыўнасць яе па гаспадарча-дагаворнай тэматыцы выражаецца ў суме каля 500 тысяч рублёў.

Вельмі плённа папрацавалі старшыя навуковыя супрацоўнікі кафедры Л. У. Шастакоў, М. І. Казлоўскі, старшы выкладчык У. І. Лаўруковіч і іншыя.

Супрацоўнікамі нашай кафедры прачытана больш 10 лекцый на заводах, ва ўстановах і ў воінскіх часцях.

Да адкрыцця з'езда мы рыхтуем стэнд «Ад з'езда да з'езда», які раскажа аб жыцці кафедры.



На здымку: начальнік аддзела праграміравання вылічальнага цэнтра **Л. А. Рута** і студэнтка VI курса вячэрняга аддзялення матфака **Л. Вылегжаніна** за наладжваннем праграмы.
Фота **Д. Чаховіча.**

## СТВОРАНА НОВАЯ КАФЕДРА

**З першага сакавіка ва універсітэце створана кафедра палітычнай эканоміі гістарычнага факультэта. На яе ўскладзена забеспячэнне навучальнага працэсу і арганізацыя навукова-даследчай работы па палітычнай эканоміі і галіновых эканамічных дысцыплінах на гістарычным і юрыдычным факультэтах.**

**Выконваць абавязкі загадчыка кафедры даручана кандыдату эканамічных навук дацэнту В. К. Драчову.**

## У ВНУ КРАІНЫ

⊙ Навукова - метадычны савет і лабараторыя навуковай арганізацыі навучальнага працэсу Варонежскага дзяржаўнага універсітэта правялі цыкл лекцый па праблемах педагогікі вышэйшай школы для выкладчыкаў, асістэнтаў і аспірантаў.

З лекцыямі перад слухачамі выступілі прафесары ВДУ, навуковыя супрацоўнікі АПН СССР, вучоныя з іншых вну.

⊙ Стварэнне студэнтамі тэхнічных вну прыбораў і ўстановак для выканання эксперыментальных даследаванняў — адзін з галоўных паказчыкаў іх удзелу ў навукова-даследчай рабоце. У сувязі з гэтым у Ленінградскім політэхнічным інстытуце імя М. І. Калініна арганізавана гарадская выстаўка навукова-тэхнічнай творчасці студэнтаў Ленінграда.

⊙ Фундаментальная бібліятэка Далёкаўсходняга політэхнічнага інстытута, кніжны фонд якой налічвае звыш чатырохсот тысяч кніг, заняла трэцяе месца па зоне Сібіры і Далёкага Усходу і другое месца па Прыморскаму краю ва Усесаюзным грамадскім аглядзе бібліятэк, прысвечаным 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

⊙ У канцы мінулага года «Акадэмкніга» правяла ў будынку філалагічнага факультэта Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта разгорнутую выстаўку-продаж кніг, выдадзеных універсітэцкім выдавецтвам і выдавецтвам «Наука». Многія вучоныя і студэнты набылі неабходныя кнігі, якія цяпер цяжка знайсці ў кніжных магазінах. А нядаўна такая выстаўка была арганізавана ў будынку гістарычнага факультэта.

## ПАВЕДАМЛЕННЕ

**16 сакавіка сектарам друку парткома універсітэта праводзіцца семінар рэдактараў і членаў рэдкалегій факультэцкіх і курсавых насценных газет.**

**Час і месца збору ўдзельнікаў семінара: 15-00, аўдыторыя № 57 юрыдычнага корпуса.**

# ЛЕНІНСКІМ СЛОВАМ

З ім сустракаліся на розных факультэтах. Высокі чалавек з сівымі валасамі падыходзіў да стала і ўважліва аглядаў аўдыторыю. Вочы яго пад шкельцамі акуляраў пераводзяць позірк з аднаго твару на другі, быццам пытаюцца: «Што хочаш пачуць ты, якія словы, каб запалі ў сэрца?»

Спакойны, крыху хрыплаваты голас. Моладзь пад яго ўладай. Яна слухае і нібы адчувае дыханне трывожных 20-х гадоў, імклівага жыцця камсамола, што распрамляў магутныя крылы, набіраючы вышыню...

Яўген Сцяпанавіч Балакін — дэлегат III, V, VI з'ездаў камсамола. Вялікае шчасце выпала на яго долю: ён бачыў і чуў Леніна. Аб гэтым і расказвае ён з хваляваннем, якое непадуладна часу, бо жыве ў сэрцы самае святое і чыстае, раз і назаўсёды пакінутае жыццём...

— Дэлегаты III з'езда камсамола сабраліся ў доме на Малой Дзмітраўцы. Святло ў зале слабае. Холадна. У першым радзе стаяць венскія крэслы, потым— простыя, а ў самым канцы— драўляныя лаўкі. Уваход толькі злева. У зале песні, гоман. І раптам зусім нечакана ўвайшоў Ленін. Па-маладому энергічнымі, хуткімі крокамі. Адзеты ў асенняе паліто, у руках — кепка. На хаду здымае паліто і кладзе яго на крэсла.

Апладысменты доўга не давалі Уладзіміру Ільічу гаварыць. А пачаў ён прамову проста: назваў нас таварышамі.

Нас, 300 з якіх мелі ніжэйшую адукацыю, 70 — дамашнюю і яшчэ невядома якую, 209 — сярэднюю і толькі 11 — вышэйшую...

Ніколі не перастане хваляваць кожная дэталь III з'езда камсамола. І якое незвычайнае ўражанне выклікаюць падзеі, калі расказваюць аб іх сведкі! Яны даносяць дыханне вялікай эпохі, набліжаюць яе да рэчаіснасці...

Яўгена Сцяпанавіча слухалі матэматыкі, фізікі, хімікі, біёлагі, філолагі, журналісты. Яму шчыра дзякавалі 2000 камсамольцаў. За дзень Яўген Сцяпанавіч выступаў па некалькі разоў. Такім гарачым было імкненне данесці моладзі ленінскае слова, данесці вобраз Леніна як жывога чалавека.

Яўген Сцяпанавіч Балакін — выпускнік філалагічнага факультэта. Надыходзячае свята універсітэта — яго свята. Выступленні перад студэнтамі — яго падарунак залатому юбілею універсітэта, яго даніна і падзяка за веды, якія вынес ён са сценаў старэйшай навучальнай установы рэспублікі.

Доўгі час Яўген Сцяпанавіч працаваў настаўнікам у Нясвіжскай сярэдняй школе. У цяперашні час — на пенсіі. Ды толькі не для Яўгена Сцяпанавіча Балакіна спакойнае жыццё. Не для камсамольца 20-х гадоў, які застанецца ім назаўсёды.

Л. СЯМЁНАЎ.

## ДЗЕНЬ ЛЕКТАРА

На мінулым тыдні выкладчыкі юрыдычнага факультэта правялі дзень лектара на Мінскім заводзе «Транзістар». З лекцыямі перад рабочымі аб праекце Дырэктыў XXIV з'езда КПСС выступілі доктар юрыдычных навук І. І. Марціновіч, дацэнты С. Р. Віхараў, М. М. Меркушаў, К. А. Барзова, кандыдаты юрыдычных навук Л. А. Прыходзька, А. А. Прымачонак, выкладчыкі і асістэнты М. К. Казлоў, М. А. Гарбар, Л. В. Глебава.

П. АНДРЭЕЎ.

## РАСКАЗВАЮЦЬ ВЫСТАЎКІ

*У чытальнай зале галоўнага корпуса аформлена кніжная выстаўка, прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння Р. Люксембург. Прадстаўленыя на выстаўцы кнігі, часопісы расказваюць аб самаадданай дзейнасці слаўнай дачкі нямецкага народа.*

*Выстаўка знаёміць з пісьмамі Розы Люксембург, пісьмамі У. І. Леніна «Членам групы «Спартак», «Адказам італьянскім, французскім і нямецкім камуністам» і пісьмамі У. І. Леніну ад групы «Спартак» і іншымі матэрыяламі.*

***

*На выстаўцы, прысвечанай 125-годдзю з дня нараджэння В. В. Дакучаева, сабраны творы выдатнага вучонага, артыкулы, даклады, а таксама літаратура аб жыцці і дзейнасці В. В. Дакучаева: І. Ф. Гаркуша «Дакучаеў і руская школа глебазнаўцаў», І. і Л. Крупенікавы «Падарожжы і экспедыцыі В. В. Дакучаева», І. А. Крупенікаў «Дакучаеў у Крыме» і іншыя.*

М. МАЦЕЙКА.

# ХЛЕБАРОБ І ВУЧОНЫ

## здабыткі * праблемы * перспектывы

**В**ЫДАТНА зарэкамендавала сябе ў рэспубліцы універсітэцкая арганізацыя таварыства «Веды». Па выніках грамадскага агляду ў сувязі з падрыхтоўкай да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна яна заняла першае месца і ўзнагароджана дыпломам І ступені. Асабліва плённа працуе лектарскі калектыў кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі на чале з прафесарам В. І. Сцяпанавым. У ленінскім юбілейным годзе супрацоўнікі гэтай кафедры прачыталі 118 лекцый. Асобныя выкладчыкі і лектарскія брыгады выязджалі ў гаспадаркі Барысаўскага, Нясвіжскага, Уздзенскага, Капыльскага раёнаў, выступалі перад працаўнікамі мінскіх прамысловых прадпрыемстваў. Так, толькі ў кастрычніку-лістападзе 1970 года лектарская група кафедры правяла дзевяць навукова-тэарэтычных канферэнцый, прысвечаных 150-годдзю з дня нараджэння Ф. Энгельса.

Цяпер, выконваючы абавязацельствы, прынятыя ў звароце навуковых супрацоўнікаў БДУ да вучоных Мінска і рэспублікі аб разгортванні навуковай прапаганды ў гонар XXIV з'езда КПСС, кафедра распрацавала новую тэматыку лекцый, планы індывідуальных выступленняў сярод насельніцтва, сфарміравала брыгады лектараў для выездаў ў падшэфныя раёны.

На мінулым тыдні адна з такіх лектарскіх брыгад прыняла ўдзел у арганізаванай Барысаўскім райкомам КПБ і абласной арганізацыяй таварыства «Веды» навукова-практычнай канферэнцыі, што праходзіла ў калгасе імя Суворава Барысаўскага раёна. Тэма яе — «Некаторыя актуальныя пытанні камуністычнага будаўніцтва».

У калгасны клуб на сустрэчу з вучонымі прыйшлі сакратары партыйных арганізацый і спецыялісты сельскай гаспадаркі навакольных гаспадарак, жывёлаводы, паляводы, настаўнікі і выпускнікі мясцовых школ. Па ўзросту слухачы самыя розныя: заслужаныя ветэраны працы і тыя, хто толькі ўступае ў жыццё, — хлопцы і дзяўчаты з запіснымі кніжкамі ў руках.

Нарэшце ў зале ўсталёўваецца цішыня. Да трыбуны падыходзіць сакратар Барысаўскага РК КПБ Зоя Эдуардаўна Кацкая. Яе слухаюць вельмі ўважліва: размова ідзе пра тое, што хвалюе кожнага з прысутных. Адну за другой называе яна лічбы, якія сведчаць аб поспехах і дасягненнях працаўнікоў раёна ў мінулай пяцігодцы. Пабудаваны новыя школы, дзіцячыя сады, бібліятэкі і клубы, добраўпарадкаваныя жылыя дамы.

Падрабязна гаворыць Зоя Эдуардаўна аб задачах на будучае, раіцца, як лепш ажыццявіць планы партыі, намечаныя ў праекце Дырэктыў па новаму пяцігадоваму плану, расказвае пра абмеркаванне яго ў суседніх гаспадарках, аб тым, якія прапановы ўносяць працоўныя ў гэты вялікі план. Размова ішла і пра недахопы, пра тое, як пазбавіцца ад іх.

Затым кандыдат філасофскіх навук дацэнт БДУ Т. П. Багданава расказала аб сучаснай навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, яе ролі ў развіцці грамадскай вытворчасці.

Толькі на аснове ўсямернага выкарыстання дасягненняў навукі і тэхнікі можна забяспечыць далейшы значны рост сельскай гаспадаркі, дабіцца істотнага павышэння жыццёвага ўзроўню народа.

Даходліва, проста і пранікнёна дацэнт Багданава гаворыць аб сутнасці навукова-тэхнічнага прагрэсу ў сельскай гаспадарцы, аб значэнні паслядоўнай інтэнсіфікацыі вытворчасці на аснове механізацыі і электрыфікацыі, шырокай меліярацыі і хімізацыі.

Яскрава праілюстраваў выказаныя палажэнні старшыня калгаса імя Суворава У. Г. Жданаў. Няма такога чалавека сярод прысутных, які б не ведаў Уладзіміра Георгіевіча. 28-гадовы старшыня кіруе гаспадаркай крыху больш як 2 гады, але аўтарытэту яму, як кажуць, не пазычаць. Любяць і паважаюць свайго кіраўніка сувораўцы. Разумным падыходам да малой ці вялікай справы, цвёрдым словам, глыбокай увагай да кожнага чалавека, партыйнай прынцыповасцю і патрабавальнасцю заваяваў ён давер'е і павагу людзей.

Старшыня гаворыць пра тое, як навукова-тэхнічны прагрэс мяняе аблічча калгаснай вёскі, як механізацыя вытворчасці паляпшае ўмовы працы, вызваляе чалавека ад цяжкіх працаёмкіх працэсаў, скарачае тэрміны сельскагаспадарчых работ.

— Штогод тэхнічная забяспечанасць нашага калгаса ўзрастае, — гаворыць У. Г. Жданаў.— Цяпер мы маем 36 трактараў, 8 збожжаўборачных камбайнаў, 15 грузавых машын, 20 сеялак і шмат іншай тэхнікі. Цяпер у калгасе поўнасцю механізаваны ворыва, сяўба, уборка збожжавых і сіласных культур.

Уладзімір Георгіевіч звярнуў вялікую ўвагу на комплексную механізацыю і аўтаматызацыю вытворчых працэсаў, развіццё работ па электрыфікацыі і меліярацыі, закрануў пытанні важнейшага кірунку тэхнічнага прагрэсу: хімізацыі і інтэнсіфікацыі гаспадаркі.

Старшыня расказаў таксама аб поспехах, якіх дабілася гаспадарка ў апошнія гады дзякуючы няўхільнаму павелічэнню тэхнічнай аснашчанасці калгаса, укараненню ў вытворчасць апошніх дасягненняў навукі.

Пасля перапынку слова зноў бяруць вучоныя. Аб месцы біялагічнай навукі ў стварэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма расказаў прысутным кандыдат філасофскіх навук Аркадзь Іванавіч Ляўко.

Ролі літаратуры і мастацтва ў выхаванні новага чалавека прысвяціў сваё выступленне дацэнт Юрый Аляксандравіч Гусеў.

Аб непрымірымасці камуністычнай і буржуазнай ідэалогій і абвастрэнні ідэалагічнай барацьбы ў сучасных умовах гаварыў доктар філасофскіх навук, прафесар Васіль Іванавіч Сцяпанаў.

Падводзячы вынікі канферэнцыі, наместнік старшыні праўлення абласной арганізацыі таварыства «Веды» А. М. Ракавец падкрэсліў:

— Наша Радзіма напярэдадні XXIV з'езда КПСС жыве вялікімі здзяйсненнямі. Працоўныя краіны дасягнулі выдатных поспехаў. Але прадстаіць зрабіць яшчэ шмат, і нашы агульныя поспехі будуць залежаць менавіта ад таго, наколькі кожны зразумее сваю ролю ў вялікім будаўніцтве. Вядома, канферэнцыя прынесла сваю карысць. Прыемна, што тут прысутнічае многа моладзі, тых, хто заўтра выйдзе на калгасную ніву альбо стане да станка на заводзе. Вядома, наша сённяшняя размова ў нейкай меры дапаможа ім правільна вызначыць свой далейшы жыццёвы шлях, задумацца яшчэ раз аб сваім месцы ў жыцці, аб тым, як можна сваёй працай прынесці найбольшую карысць Радзіме.

Навукова - практычная канферэнцыя закончылася. Але прысутныя не спяшаліся разыходзіцца. У зале, у фае клуба працягваліся гарачыя спрэчкі, абмеркаванне пачутага. Калгаснікі, школьнікі, настаўнікі гутарылі з прадстаўнікамі універсітэта.

Я падышла да дзвюх жанчын, якія ажыўлена размаўлялі, і папрасіла іх падзяліцца ўражаннямі аб канферэнцыі.

— Якраз аб гэтым мы і гутарылі, — адказала Герой Сацыялістычнай Працы заслужаны аграном рэспублікі дырэктар саўгаса «Стары Барысаў» Ганна Казіміраўна Вяржбіцкая. — Хачу сказаць, што карысць ад такіх сустрэч вялікая. Шмат пачулі новага, цікавага. Мы вельмі задаволены, што вучоныя прыехалі менавіта сюды, да працаўнікоў, якія непасрэдна ўкараняюць навуковыя дасягненні ў вытворчасць.

Субяседніца Ганны Казіміраўны брыгадзір гародніцкай брыгады таго ж саўгаса дэпутат Вярхоўнага Савета СССР Раіса Сямёнаўна Самцова пашкадавала, што з іх гаспадаркі на канферэнцыі прысутнічала ўсяго 12 чалавек. Такія канферэнцыі, сказала яна, трэба праводзіць як мага часцей. Яны дапамагаюць кожнаму чалавеку лепш усвядоміць сваё месца ў вялікай справе будаўніцтва камунізма, адчуць глыбокую адказнасць за выкананне намечаных партыяй задач.

— Я з прыемнасцю назірала за ўважлівымі тварамі юнакоў і дзяўчат. Відавочна, што размова, якая адбылася тут сёння, дала ім шмат карыснага, патрэбнага. Упэўнена, яна прымусіла нашу будучую змену сур'ёзна задумацца над многімі надзённымі пытаннямі.

Мне давялося пагутарыць і з Кацярынай Рыгораўнай Цялегай, свінаркай калгаса імя Суворава дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР.

— Я вельмі задаволена тым, што пабывала на гэтай цікавай сустрэчы з вучонымі. Аб тым, што я пачула на канферэнцыі, абавязкова раскажу сваім сяброўкам.

А. АЛЕКСАНДРОВІЧ.
Наш спец. кар.




*На здымках: сустрэча хлебаробаў і вучоных у калгасе імя Суворава.*



**Як заўсёды, у час сустрэчы вясёлых і знаходлівых, актавая зала галоўнага корпуса ледзь умясціла балельшчыкаў і гасцей. На гэты раз у барацьбу ўступілі фізікі і філолагі. Абедзве каманды аказаліся дастойнымі саперніцамі, і адвечная спрэчка фізікаў з лірыкамі ў гэты вечар завяршылася нічыйным вынікам.**

**На здымках:** выступаюць каманды фізікаў (унізе) і філолагаў (справа).

Фота **В. Жука.**






# ДЭВІЗ—ІМПРАВІЗАЦЫЯ

*Сустрэчай фізікаў і філолагаў пачалося першынство універсітэта сярод каманд КВЗ 1971—1972 гадоў. Цяпер праходзяць сустрэчы, пераможцы якіх разам з камандамі факультэта журналістыкі і хімічнага факультэта сустрэнуцца ў фінальнай частцы турніру.*

*У гэтым семестры будуць праведзены яшчэ дзве сустрэчы: 30 сакавіка памераюцца сіламі матэматыкі і біёлагі, а 16 красавіка—гісторыкі і географы. Вельмі шкада, што ад удзелу ў першынстве адмовілася моцная каманда юрыдычнага факультэта.*

*Такія планы на бліжэйшае будучае. А цяпер некалькі слоў аб КВЗ увогуле. Мы ўсе крыху разбалаваны тэлевізійнымі перадачамі КВЗ і таму часам пакідаем сустрэчы першынства універсітэта незадаволенымі. Але давайце не забываць, што КВЗ па тэлебачанні — гэта перш за ўсё спектакль, прадстаўленне. Наш жа дэвіз — імправізацыя, імправізацыя і яшчэ раз імправізацыя. Вядома ж, наш КВЗ прайграе тэлевізійнаму відовішчна, але ж затое выйграе як сапраўднае спаборніцтва вясёлых і знаходлівых. А іменна ў гэтым і заключаецца прыгажосць КВЗ, яго папулярнасць.*

*У. КАН,*
*старшыня аргкамітэта.*

# ЗДАРОЎЕ І МОДА

МОДА — гэта часовае панаванне густаў у быце і, бадай, у першую чаргу ў адзенні. Яна няспынна мяняецца. Для нашых дзён характэрна тэндэнцыя стварыць выгаднае, простае і элегантнае адзенне, абутак, мэблю.

Але, на жаль, людзі, якія прытрымліваюцца моды, не заўсёды выконваюць патрабаванні, неабходныя для захавання і ўмацавання здароўя, парой не ўлічваюць свае індывідуальныя асаблівасці. Часта сляпое захапленне модай з'яўляецца неэстэтычным, вульгарным.

Савецкі стыль у **адзенні** — прастата, сціпласць, прыгажосць і мэтазгоднасць. Адзенне павінна садзейнічаць здароўю чалавека. Зараз яшчэ модныя кароткія сукенкі, тонкая бялізна, панчохі. Усе гэтыя рэчы прыгожыя, але яны недастаткова цёплыя, могуць прывесці да пераахаладжэння і захворвання рэўматызмам, запаленнем мачавога пузыра і прыдаткаў.

Адзенне павінна быць свабодным, не затрымліваць рухаў, не сціскаць цела.

У апошні час шырока выкарыстоўваюцца вырабы з сінтэтычных тканін. Яны бясшкодныя. Аднак дрэнная гіграскапічнасць, павышаная адчувальнасць да іх у некаторых людзей могуць стаць прычынай узнікнення скураных захворванняў. Такім людзям карыстацца вырабамі з капрону, нейлону і іншых сінтэтычных тканін можна толькі параіўшыся з урачом.

Хворым на радзікуліт, рэўматызм, поліартрыт, міазіт карысна насіць хларынавую бялізну. Лячэбны эфект яе тлумачыцца ўзмацненнем кровазвароту ў скуры і мышцах.

Гігіенічнае значэнне мае правільнае карыстанне адзеннем. Новую бялізну нельга надзяваць не вымытай або не адпрасаванай, таму што ў тканінах могуць знаходзіцца ўзбуджальнікі інфекцыйных захворванняў. Бялізну трэба мяняць не менш аднаго разу ў тыдзень, захоўваць у чысціні верхняе адзенне. Панчохі і шкарпэткі трэба кожны дзень мяняць і мыць. Не рэкамендуецца ў халоднае надвор'е насіць капронавыя панчохі, пальчаткі з капрону і нейлону і іншых сінтэтычных валокнаў, а таксама цесныя скураныя пальчаткі, асабліва людзям з чырвонай і сінюшнай скурай рук.

**Абутак** павінен адпавядаць размеру і форме ступні, захоўваць яе ад дэфармацыі, не здаўліваць сасуды, нервы, адпавядаць умовам клімату, пары года, умовам працы.

Адышла мода на туфлі з вузкім і доўгім наском, на «шпільках». Насок стаў больш шырокім, абцас больш устойлівым. Гэта новая мода больш рацыянальная з пункту гледжання медыцыны. Шкодным з'яўляецца цесны і занадта свабодны, шырокі абутак. Цесны абутак, які здаўлівае ступню, парушае кровазварот, павышае патлівасць у цёплае надвор'е, зімой вядзе да ахаладжэння і нават да абмаражэння.

Пры працяглым нашэнні цеснага абутку парушаецца функцыя ступні, знявечваюцца пальцы, з'яўляюцца мазалі, ранкі, якія прыводзяць часта да захворвання скуры. Занадта высокія абцасы пры пастаянным нашэнні шкодныя, асабліва юным дзяўчатам. Адбываецца дэфармацыя пазваночніка, парушаецца асанка, зрушваюцца органы брушной поласці і малога таза. Гэта шкодна ўплывае на дзейнасць страўніка, кішэчніка і іншых унутраных органаў.

Не адпавядае гігіенічным патрабаванням гумавы абутак — ён затрымлівае выпарэнні скуры. Насіць яго можна толькі непрацяглы час. Вельмі шкодны гумавы абутак хворым рэўматызмам, скурнымі і іншымі захворваннямі ног, а таксама тым, хто адчувальны да ахаладжэння.

* * *

Імкненне стаць прыгожымі прымушае жанчын карыстацца дапамогай касметыкі. Касметыка, якая ўжываецца з густам і ўмерана, ўпрыгожвае жанчыну. Калі ж ёю злоўжываць — атрымаецца зусім непажаданы вынік. Асабліва небяспечна выкарыстоўваць без разбору ўсе новыя касметычныя крэмы, мазі, фарбаванне броваў і вейкаў урсолам, карыстанне касметычнымі сродкамі не фабрычнай вытворчасці.

Пры доглядзе скуры твару неабходна ведаць яе асаблівасці. Скура можа быць сухой, тлустай і нармальнай. Ад характару скуры залежыць выбар касметычных сродкаў. Пры сухой скуры нельга прымянць растворы, якія ўтрымліваюць спірт (ласьёны, туалетную ваду, адэкалон), мыла, шчолачныя вадкасці, бо гэта яшчэ больш перасушвае скуру і можа прывесці да павелічэння маршчын, да шалушэння і трэшчын.

Для адбельвання і жыўлення скуры карысна частае прымяненне фруктова-ягадных і гародніх масак.

На стан валасоў аказвае вялікі ўплыў цэнтральная нервовая сістэма. Прынесці шкоду можа празмерная стомленасць, недасынанне, пастаяннае нервовае напружанне. Шкодна ўплывае і алкаголь, курэнне, злоўжыванне моцным чаем і кавай.

Асноўнае пры доглядзе валасоў—чысціня. Мыць галаву рэкамендуецца гарачай вадой (прыкладна 45°). Яна добра ачышчае валасы, паляпшае кровазварот і абмен рэчываў у скуры. Нельга скручваць, выціскаць валасы. Дабратворна ўплывае на рост валасоў, надае ім бляск і мяккасць мыццё галавы малочна-кіслымі прадуктамі. Шкодна празмерна частае мыццё галавы. Сухія і нармальныя валасы рэкамендуецца мыць адзін раз у 2—3 тыдні, тлустыя — раз у 7—10 дзён.

Прычоска не павінна туга сцягваць валасы. Гэта парушае жыўленне і рост валасоў. Шын'ёны і штучныя косы трэба рэгулярна мыць. Вельмі шкодныя для валасоў начос і перманет. Пры любой прычосцы нельга карыстацца вялікай колькасцю шпілек. Нельга лічыць зусім няшкоднымі хімічныя фарбы, і таму выкарыстоўваць іх трэба як можна радзей. Галаўны ўбор павінен быць дастаткова свабодным, паветрапрапускаемым.

Шкодна хадзіць круглы год з непакрытай галавой. Няўмеранае апраменьванне сонцам летам перасушвае валасы, прыводзіць да іх выпадання. Нізкая тэмпература зімой выклікае спазмы сасудаў скуры, што перашкаджае жыўленню валасоў і таксама прыводзіць да іх выпадання.

Вялікім раздражняльнікам з'яўляецца сонечнае апраменьванне. Пад яго ўплывам паляпшаюцца акісляльныя і абменныя працэсы ў арганізме, функцыя кроваўтварэння, а таксама адбываецца ўмацаванне розных ахоўных функцый. Але пры некаторых захворваннях сардэчна-сасудзістай, нервовай сістэм, пры захворваннях шчытападобнай жэлезы, печані, почак, хворым туберкулёзам знаходжанне на сонцы супрацьпаказана і можа прынесці вялікую шкоду. Сонечныя ванны лепш за ўсё прымаць раніцай ад 8 да 11 гадзін. Пачынаць загараць трэба паступова. Няўмелае карыстанне сонцам можа прывесці да апёкаў і пагаршэння самаадчування.

# ЦІКАВАЯ СУСТРЭЧА

**З нагоды свята 8 Сакавіка на падрыхтоўчым факультэце адбылася сустрэча в'етнамскіх студэнтаў з былым ваенурачом падпалкоўнікам медслужбы Яўгеніяй Яўстаф'еўнай Сярковай. Яна расказала аб тым, як у гады Вялікай Айчыннай вайны савецкія жанчыны поплеч з мужчынамі змагаліся супраць ворага, як яна сама разам з сябрамі выратавала хворых людзей, якія былі вызвалены Савецкай Арміяй з фашысцкага лагера ў Азарычах.**

**В'етнамскія студэнты падрыхтавалі цёплую сустрэчу жанчыне-ветэрану Вялікай Айчыннай вайны.**

**М. ДЗЯТКОВА.**

*ПАВЕДАМЛЕННЕ*

**ШТОМЕСЯЧНА Ў ПЕРШУЮ І ТРЭЦЮЮ СЕРАДЫ Ў ПАКОІ № 215 ГАЛОЎНАГА КОРПУСА З 16.00 ДА 18.00 ПРАЦУЕ ЮРЫДЫЧНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ НА ГРАМАДСКІХ АСНОВАХ ДЛЯ СУПРАЦОЎНІКАЎ І СТУДЭНТАЎ УНІВЕРСІТЭТА.**

# ПАКУЛЬ НЕ РАСТАЎ ЛЁД

На пачатак сакавіка прыйшліся старты нашых канькабежцаў. Першынство універсітэта па канькабежнаму спорту праходзіла на стадыёне «Працоўныя рэзервы». У пяты раз запар чэмпіёнскі тытул заваявала студэнтка V курса хімфака Ніна Матусевіч. Чэмпіёнам стаў і Аляксандр Янушка, студэнт II курса факультэта прыкладной матэматыкі.

Камандныя месцы размеркаваліся наступным чынам: I — ФПМ, II — хімфак, III — філфак, IV — фізфак, V — юрфак, VI — журфак. Астатнія факультэты не змаглі выставіць каманды.

НАШ КАР.

Згублены студэнцкі білет за № 70225, выдадзены на імя студэнткі матэматычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта Л. І. Мілаванавай, лічыць несапраўдным.

Згублены студэнцкі білет за № 70347, выдадзены на імя студэнткі матэматычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта Т. У. Казей, лічыць несапраўдным.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон—22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
АТ 08608 Зак. 321. Тыраж 2.000 экз.